Установа адукацыі
"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ"

УДК 331.5(476)

КАЗЛОЎ АЛЯКСЕЙ СЦЯПАНАВІЧ

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ РЫНКІ ПРАЦЫ Ў ТРАНСФАРМАЦЫЙНАЙ ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ

08.00.01 – эканамічная тэорыя

**АЎТАРЭФЕРАТ**

дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата эканамічных навук

Мінск 2006

Работа выканана ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт".

Навуковы кіраўнік – доктар эканамічных навук, прафесар Кулажанка Уладзімір Андрэевіч, УА "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", кафедра эканамічнай тэорыі і маркетынгу

Афіцыйныя апаненты: доктар эканамічных навук, прафесар Ванкевіч Алена Васільеўна, УА "Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", кафедра менеджменту

кандыдат эканамічных навук, дацэнт Базылева Марына Мікаласўна, УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт", кафедра эканамічнай тэорыі і гісторыі эканамічных навук

Апаніруючая арганізацыя – Установа "Навукова-даследчыцкі інстытут працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь".

Абарона адбудзецца "25" красавіка 2006 г., у $14^{00}$ гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.01.05 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт" па адрасу: 220030, Мінск, вул. Ленінградская, 8, ауд. 407 юрыдычнага факультэта БДУ. Тэл. вуч. сакратара (8-017) 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца у бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "    " сакавіка 2006 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый
кандыдат эканамічных навук, дацэнт П.С. Лямешчанка

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.***

У сучасны момант сацыяльна-эканамічная сістэма Беларусі знаходзіцца ў працэсе трансфармацыі з планава-адміністрацыйнай у сацыяльна-арыентаваную рыначную. Значная ўвага надаецца рэгіянальнаму эканамічнаму развіццю, павышэнню ўзроўню жыцця ў малых і сярэдніх гарадах, сельскай мясцовасці. Паколькі найбольш важным унутраным рэсурсам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца чалавечы капітал, таму неабходна забяспечыць яго эфектыўнае выкарыстанне, назапашванне і ўзнаўленне, асабліва на рэгіянальным узроўні. У сувязі з гэтым істотным элементам працэсу трансфармацыі з'яўляецца эфектыўнае рэгуляванне і развіццё рэгіянальных рынкаў працы. Ад таго, наколькі паспяхова гэта будзе адбывацца і якімі будуць сацыяльныя выдаткі грамадства ў выглядзе беспрацоўя і зніжэння ўзроўню жыцця, залежыць паспяховасць усяго працэсу трансфармацыі эканомікі. У выніку рэформаў неабходна забяспечыць мінімальныя сацыяльныя выдаткі грамадства і максімальны эканамічны эфект ад выкарыстання працоўных рэсурсаў эканомікі, а таксама рэгіянальна-раўнамернае сацыяльна-эканамічнае развіццё ў краіне.

Эфектыўныя ў доўгатэрміновым перыядзе рашэнні дзяржаўных органаў патрабуюць добра распрацаванай метадалагічнай базы для маніторынгу сацыяльна-эканамічных працэсаў у рэгіёнах. Неабходна вызначыць тэндэнцыі і ўзаемазалежнасці сацыяльна-эканамічных працэсаў на ўзроўні малых гарадоў і раёнаў. Існуе патрэба ў вызначэнні і навуковым тлумачэнні рэакцый рэгіянальных і лакальных рынкаў працы на адпаведныя рэгулюючыя акты. З мэтай забеспячэння рэгіёнаў высокакваліфікаванымі працоўнымі рэсурсамі, а таксама вырашэння дэмаграфічнай праблемы на рынку працы неабходна вызначыць фактары, што ўплываюць на павышэнне канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на ўзроўні раёнаў, і фактары, якія ўплываюць на рэгіянальныя міграцыйныя плыні.

Вывучэннем рэгіянальных рынкаў працы ў Беларусі ў розныя часы займаліся такія вядомыя айчынныя даследчыкі, як Ванкевіч А.В., Базылеў М. І., Базылева М.М., Бондар А.В., Морава А.П., Новікава І.В., Бутоўская В.М., Бабкова І.Н., Давыдзенка Л.М., Баравік Л.С., Клюня У.Л., Кулажанка У.А., Сокалава Г.М., Струк Т.Г., Лешчалоўскі П.В., Ткачэнка С.С., Удовенка І.М., Ціханава Л.Е., Юк З.М., а таксама замежныя Капялюшнікаў Р.І., Вішнеўская І.Т., Квяткоўскі М., Скарпэта С., Хубэр П., Тодаро М. і інш. Пастаўленыя гэтымі аўтарамі праблемы патрабуюць абагульнення і пастаяннага ўдасканалення для выпрацоўкі больш эфектыўных праграм дзяржаўнага рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы. Метадалагічныя распрацоўкі, што існуюць у дадзены момант, датычацца галоўным чынам даследаванняў асобна ўзятых рэгіёнаў на ўзроўні раёнаў або абласцей. Аднак адсутнічае параўнанне ўсіх рынкаў працы на раённым узроўні і іх тыпалагізацыя ў залежнасці ад структуры занятасці.

Актуальнасць вызначаных праблем, важнасць дадатковых тэарэтычных даследаванняў і практычных распрацовак абумоўліваюць неабходнасць правядзення даследавання, яго мэту і задачы.

***Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.***

Дысертацыйная праца выконвалася ва ўзаемасувязі з навуковым даследаваннем на кафедры эканамічнай тэорыі і маркетынгу БДТУ "Эканамічныя праблемы структурных пераўтварэнняў у прамысловасці ў пераходны перыяд" 2000-2005 гг.

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта
2120 ар

№ ГБ 35–20, а таксама "Рэструктурызацыя вытворчасці і павышэнне інвестыцый у чалавечы капітал" 2005–2007 гг., № Г05-М047.

***Мэта і задачы даследавання.***

Мэтай даследавання з'яўляецца развіццё і ўдасканаленне навукова абгрунтаваных тэарэтычных і метадалагічных падыходаў рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы, а таксама выяўленне тэндэнцый і працэсаў, што усталяваліся на рэгіянальных рынках працы ва ўмовах трансфармацыйнага перыяду ў Рэспубліцы Беларусь.

У адпаведнасці з пастаўленай мэтай даследавання ў дысертацыі вырашаліся наступныя тэарэтычнага і прыкладнога характару задачы:

- даследаваць заканамернасці і механізмы функцыянавання рынкаў працы ва ўмовах трансфармацыі эканомікі, выявіць асаблівасці рэгіянальных рынкаў працы ў Беларусі; вызначыць прычыны і маштабы рэгіянальнай дыферэнцыяцыі беспрацоўя ў Беларусі; выявіць магчымасці самарэгулявання рэгіянальных рынкаў працы пры дапамозе ўнутранай рэгіянальнай мабільнасці працоўнай сілы і ацаніць яе ўплыў на ліквідаванне рэгіянальных дыспрапорцый у працэсе дастасавання попыту і прапановы на рэгіянальных рынках працы;
- вывучыць і крытычна прааналізаваць дзеючыя ў сусветнай практыцы методыкі тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы і распрацаваць методыку тыплагізацыі на аснове рэгіянальнай структуры занятасці і паказчыкаў развіцця рэгіёна;
- вызначыць спецыфічны тып занятасці па самазабеспячэнню, умовы яго пашырэння і прычыны ўзнікнення, а таксама ўплыў на ўзровень жыцця і прадукцыйнасць працы;
- распрацаваць методыку аналізу і маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рэгіянальным узроўні;
- унесці метадычныя прапановы па фарміраванню Дзяржаўнай і рэгіянальных праграм занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь і распрацаваць падыходы да ўстойлівага рэгіянальна-раўнамернага развіцця эканомікі Беларусі.

***Аб'ект і прадмет даследавання.***

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца рэгіянальныя рынкі працы Рэспублікі Беларусь (у абласным і раённым адміністрацыйным падзеле).

Прадметам даследавання выступаюць эканамічныя адносіны, заканамернасці, працэсы і праблемы функцыянавання і рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы ў Беларусі ў перыяд трансфармацыі.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.***

Метадалагічнай асновай даследавання сталі працы айчынных і замежных вучоных у галіне даследаванняў рынку працы. У фарміраванні навуковай пазіцыі аўтара вызначальную ролю адыгралі даследаванні названых вышэй аўтараў.

У дысертацыйнай працы выкарыстоўваліся метады навуковага абстрагавання, дэдукцыі і індукцыі, параўнаўчага, лагічнага і сістэмнага аналізу, метады статыстычнага і рэгрэсійнага аналізу, метад паслядоўнага шматмернага выбарачнага працэсу, метад кластэрнага аналізу, графічны метад, а таксама сацыялагічныя метады даследаванняў. У якасці інфармацыйнай асновы даследавання выкарыстоўваліся дадзеныя Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства працы і сацыяльнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, айчынныя і замежныя навуковыя публікацыі. З мэтай сістэматызацыі вялікай колькасці статыстычных дадзеных была

створана база дадзеных у СКБД "MS Access", разлікі праводзіліся пры дапамозе пакета "MS Excel".

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.***

Распрацаваны навукова абгрунтаваныя падыходы па вызначэнню прыярытэтных накірункаў рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы у Рэспубліцы Беларусь, выяўлены фактары, якія зніжаюць эфектыўнае выкарыстанне працоўнага патэнцыялу краіны ва ўмовах трансфармацыйнага працэсу. Найбольш істотнымі вынікамі даследавання з'яўляюцца наступныя.

✓ Вызначаны дыспрапорцыі на рэгіянальных рынках працы, якія заключаюцца ў рэгіянальна-нераўнамерным размеркаванні беспрацоўя паміж раёнамі Беларусі, даследаваны тэндэнцыі і ўплыў рэгіянальнай міграцыі працоўнай сілы, якія з'яўляецца недастатковым для самарэгулявання попыту і прапановы на рэгіянальных рынках працы і не ў стане ліквідаваць рэгіянальныя адрозненні беспрацоўя без адпаведнага дзяржаўнага рэгулявання.

✓ Распрацавана методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы на падставе структуры занятасці ў рэгіёне і фактараў эканамічнага развіцця (узроўню развіцця інфраструктуры і сферы паслуг) метадам паслядоўнага шматмернага выбарачнага працэсу. Выдзеленыя пры дапамозе яе групы рэгіёнаў характарызуюцца падобнымі паводзінамі індыкатараў рынку працы. Праведзеная тыпалагізацыя дазволіла выявіць прычынную залежнасць узроўню беспрацоўя ад структуры занятасці ў рэгіёне і ўзроўню развіцця інфраструктуры. Абгрунтавана аб'ектыўная неабходнасць дыверсіфікацыі структуры занятасці на рэгіянальным узроўні, якая заключаецца ў стварэнні ўмоў і стымулаў для рэалакацыі працоўных рэсурсаў паміж галінамі вытворчасці і рознымі формамі ўласнасці з мэтай павышэння эфектыўнасці занятасці.

✓ Раскрыты наступствы "кансервацыі" дэпрэсіўных рэгіянальных рынкаў працы і тэндэнцыя пашырэння занятасці па самазабеспячэнню як асабліваму спосабу падтрымання ўзроўню жыцця беспрацоўных. Разгледжаны прырода гэтай з'явы, умовы яе ўзнікнення і пашырэння, а таксама ўплыў на прадукцыйнасць працы і ступень захавання вытворчых здольнасцей працоўнай сілы.

✓ Удасканалена методыка вызначэння ўзроўню і маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь на падставе разліку інтэгральных і прыватных індэксаў. Абгрунтавана неабходнасць павышэння канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рэгіянальным узроўні праз дадатковыя інвестыцыі ў чалавечы капітал і разгледжаны спосабы іх стымулявання. Выяўлена аб'ектыўная неабходнасць рэструктурызацыі эканомікі рэгіёна і горадаўтваральных прадпрыемстваў як спосаб павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў рэгіёна.

✓ Зроблены прапановы па фарміраванню Дзяржаўнай і рэгіянальных праграм занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь. З улікам палітыкі павышэння занятасці абгрунтавана канцэпцыя рэгіянальнай палітыкі занятасці, якая улічвае міжрэгіянальную мабільнасць працоўнай сілы і заснавана на стымуляванні павышэння ўзроўню ўзнаўлення працоўнай сілы і занятасці ў малых населеных пунктах. Такі падыход з'яўляецца больш эфектыўным ва ўмовах працэсу трансфармацыі, паколькі дазваляе прадухіліць адмоўны міграцыйны эфект, у выніку якога новастворана працоўныя месцы ў буйных гарадах будуць займацца імігрантамі з сельскай мясцовасці, што не дазволіць знізіць беспрацоўе, а, наадварот, павышае напружанасць і негатыўныя тэндэнцыі на рэгіянальных рынках працы.

***Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў.***

Распрацаваныя ў дысертацыі прапановы выкарыстоўваліся пры фарміраванні рэгіянальных праграм занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Выдзеленыя ў даследаванні заканамернасці могуць быць улічаны рэгіянальнымі і мясцовымі кіруючымі органамі ў мэтах павышэння інтэнсіўнасці развіцця гаспадаркі пры эфектыўным выкарыстанні працоўнай сілы. Распрацаваныя ў дысертацыі метадалагічныя палажэнні, такія, як методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы, інструмент маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рэгіянальным узроўні, а таксама вызначаныя заканамернасці унутранай працоўнай міграцыі могуць выкарыстоўвацца дзяржаўнымі кіруючымі органамі для выяўлення канкурэнтных пераваг рэгёнаў і прыняцця рэгулюючых мер з мэтай рэгіянальна-раўнамернага развіцця. Методыка вызначэння канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгёнах можа прымяняцца дзяржаўнымі, прыватнымі і міжнароднымі інвестарамі з мэтай вызначэння найбольш аптымальнага размяшчэння капіталу.

Эканамічная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што яны скіраваны на рэгіянальна-раўнамернае эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь ў працяглай перспектыве згодна са Стратэгіяй устойлівага развіцця, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання чалавечага капіталу рэгёнаў і малых гарадоў.

Сацыяльная значнасць праведзенага даследавання у першую чаргу заключаецца ў павышэнні эфектыўнасці занятасці за кошт зніжэння схаванага беспрацоўя, павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва, асабліва ў рэгёнах, развіцці чалавечага фактара і павышэнні аддачы ад інвестыцый у чалавечы капітал.

Асноўныя палажэнні дысертацыі выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе (дысцыпліны "Эканамічная тэорыя", "Рынак працы"). Атрыманыя ў межах дысертацыйнага даследавання вынікі выкарыстоўваліся пры кіраванні навукова-даследчыцкай працай № Г05-М047 (ФФ 25-027) "Рэструктурызацыя і павышэнне інвестыцый у чалавечы капітал" (2005-2006 г.г.)

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.***

1. Вызначаныя дыспрапорцыі ў размеркаванні беспрацоўя на рэгіянальных рынках працы (у раённым падзеле) не могуць быць ліквідаваны пры дапамозе рыначных механізмаў самарэгулявання, за кошт рэгіянальнай мабільнасці працоўнай сілы, таму паўстае неабходнасць адпаведных дзяржаўных мер па рэгуляванню і стымуляванню рэгіянальна-раўнамернага развіцця.

2. Распрацаваная методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы на аснове рэгіянальнай структуры занятасці ў раёнах Рэспублікі Беларусь і індыкатараў развіцця (узровень развіцця інфраструктуры і гандлю) пры дапамозе метаду паслядоўнага шматмернага выбарачнага працэсу дазваляе выдзеліць групы рэгёнаў з падобнымі паводзінамі паказчыкаў рынку працы, у першую чаргу ўзроўню беспрацоўя.

3. Выяўленыя тэндэнцыі пашырэння занятасці па самазабеспячэнню, што асабліва праяўляецца ў "дэпрэсіўных" раёнах з адносна высокім беспрацоўем, з'яўляюцца пэўнай стратэгіяй падтрымання жыццёвага ўзроўню і працоўных здольнасцей беспрацоўнага насельніцтва, пры гэтым зніжаецца прадукцыйнасць працы.

4. Удасканаленая методыка вызначэння канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рэгіянальным узроўні пры дапамозе прыватных і інтэгральных індэксаў дазваляе праводзіць пастаянны маніторынг канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгёнах і своечасова прадпрымаць рэгулюючыя дзеянні з боку дзяржавы па яе павышэнню, а

таксама дае магчымасць вызначаць адносныя перавагі рэгіёнаў пры выбары рэгіёна для інвестыцыйных укладанняў. Павышэнне канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы адбываецца праз інвестыцыі ў чалавечы капітал, што дазваляе павышаць занятасць ў рэгіёне.

5. Распрацаваныя ў выніку даследавання прапановы па фарміраванню і ўдасканаленню Дзяржаўнай праграмы занятасці і сацыяльнай палітыкі могуць быць комплексам мер для стымулявання рэгіянальна-раўнамернага развіцця і павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўнага патэнцыялу краіны.

***Асабісты ўклад суіскальніка.***

Усе вынікі дысертацыйнага даследавання, што выносяцца на абарону, атрыманыя аўтарам самастойна пры кансультаванні навуковым кіраўніком.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.***

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання былі дакладзены і абмяркоўваліся на 14 канферэнцыях, у тым ліку 7 міжнародных і 3 рэспубліканскіх. Сярод іх: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Праблемы эканамічнага развіцця рэгіёна”, (ГрДУ, г. Гродна, 2004 г.), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя для аспірантаў і маладых вучоных “Кіраванне эканамічным патэнцыялам рэгіёна ва ўмовах міжнароднай інтэграцыі”, (ГДУ, г. Гомель, лістапад 2004 г.), V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Праблемы стварэння механізму канкурэнтаздольнага менеджменту” (УП “Гипросвязь”, 2005 г.), 3-я Міжнародная навуковая канферэнцыя “Мадэльныя праграмы рэструктурызацыі і рэфармавання эканомікі” (Мінск, чэрвень 2005), XII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Управление в социальных и экономических системах” (Мінск, снежань 2004 г.) і іншыя.

***Апублікаванасць вынікаў.***

Асноўныя вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 16 навуковых публікацыях агульным аб’ёмам 61 старонка, у тым ліку 6 артыкулаў ў рэцэнзаваных часопісах і выданнях, 7 матэрыялаў міжнародных канферэнцый і 3 тэзісы дакладаў на канферэнцыях.

***Структура і аб’ём дысертацыі.***

Дысертацыя складаецца з агульнай характарыстыкі, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і 8 дадаткаў. Праца прадстаўлена на 173 старонках, у т. л. 105 старонак – даследчыцкая частка, якая змяшчае 29 табліц, 14 малюнкаў. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 174 назвы і прадстаўлены на 9 старонках.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

**У першай главе “Рынкі працы ў працэсе трансфармацыі эканомікі”** даследаваны заканамернасці і механізмы фарміравання і функцыянавання рэгіянальных рынкаў працы, а таксама іх асаблівасці ва ўмовах трансфрамацыі эканомікі Беларусі.

Вызначэнне беспрацоўя ў заходняй эканамічнай навуцы перацярпела значныя змены і ўдасканальвалася ў працэсе сваёй эвалюцыі. Пачынаючы ад “прафесійнай бяздзейнасці” паводле Гобса і “лішку працоўнай сілы” згодна А. Сміту былі развіты асобныя мадэлі, якія паказваюць уплыў беспрацоўя на іншыя макраэканамічныя паказчыкі, такія, як інфляцыя, прадукцыйнасць працы, узровень жыцця і іншыя, распрацавана таксама тэорыя выбару на мікраўзроўні ў дачыненні да беспрацоўя. Аднак ва ўмовах фарміравання рынку працы падчас трансфармацыйных зменаў ў

постсавецкіх краінах існуюць пэўныя супярэчнасці ў вызначэнні беспрацоўя, а некаторыя заканамернасці рынку працы праяўляюцца інакш, чым ва ўмовах развітой рыначнай гаспадаркі. Таму выпрацаваная ва ўмовах рыначнай эканомікі азначэнне беспрацоўя патрабуе ўдакладненняў і ўліку асаблівасцей пераходнай эканомікі.

Параўноўваючы краіны трансфармацыі, можна выдзеліць дзве мадэлі дастасаванняў на рынку працы. Першая характэрна для краін, якія правялі хуткія рыначныя рэформы, так званая "шокавая тэрапія" (Польшча, Венгрыя і інш.). Тут адзначаецца рэзкі і глыбокі спад ВУП, а таксама значны рост яўнага беспрацоўя. У пазнейшым перыядзе назіраецца актывізацыя і эканамічны рост з частковым скарачэннем беспрацоўя. Цяжар рэформ у гэтай мадэлі трансфармацыйнай эканомікі прыйшоўся на занятасць, са значным яе скарачэннем. Высокі ўзровень беспрацоўя пры гэтым аказаўся досыць устойлівым і цяжка ліквідуемым па прычыне гістэрэзісу беспрацоўя. Другая мадэль (характэрная для краін СНД, у тым ліку і Беларусі) характарызуецца павольнай і асцярожнай палітыкай рэформаў у спалучэнні з пратэкцыяністкай палітыкай у сектары вытворчасці, а таксама павольным і менш глыбокім зніжэннем ВУП. Для гэтай мадэлі характэрны нізкі ўзровень афіцыйнага беспрацоўя і высокі ўзровень схаванага. У працэсе рэструктурызацыі адзначылася трывалая сувязь з прадпрыемствам. Работнікі працягвалі працаваць на прадпрыемстве, атрымліваючы нізкія зарплаты або згаджаючыся на іх затрыманне, карысталіся пры гэтым іншымі формамі сацыяльных даброт прадпрыемства. Такім чынам, адсутнасць раўнавагі на рынку працы выявілася ў назапашванні схаванага беспрацоўя пры значным паніжэнні рэальных зарплат (і прадукцыйнасці працы).

Можна выдзеліць наступныя прычыны нізкага ўзроўню беспрацоўя характэрныя для беларускай эканомікі і іншых постсавецкіх краін.

1. Утрыманне залішняй працоўнай сілы. Прадпрыемствы захоўвалі рабочую сілу нават тады, калі яе колькасць была відавочна залішняй. Гэтаму спрыяла эканамічная палітыка дзяржавы, якая імкнулася стрымаць вызваленне ад лішкаў рабочай сілы і папярэдзіць сацыяльны выбух. На ранніх этапах трансфармацыі галоўным інструментам выступалі прамыя субсідыі, якія дазвалялі неэфектыўным прадпрыемствам утрымлівацца ад банкруцтва.

2. Жаданне работнікаў працаваць нават пры значным зніжэнні рэальнай заработнай платы. Распаўсюджаным спосабам зніжэння рэальнай заработнай платы служылі затрымкі ў яе выплаце (асабліва ў перыяд высокай інфляцыі). Гэта дазваляла прадпрыемствам падтрымліваць высокі попыт на працоўную сілу, перасцерагаючы тым самым рэзкі ўздым адкрытага беспрацоўя.

3. Адток з шэрагаў рабочай сілы ў эканамічную неактыўнасць і нефармальны сектар быў важным амартызатарам, які дазволіў стрымаць патэнцыйны рост беспрацоўя. Падобны эфект мела нефармальная занятасць. Яна паглынала тых, хто не мог атрымаць месца працы ў фармальным сектары і каму пры іншых умовах пагражала беспрацоўе. Часта працаўнікі пераходзілі з "ценявой" у адкрытую занятасць і наадварот, мінаючы стадыю беспрацоўя.

4. У Беларусі і іншых краінах СНД былі абмежаваныя маштабы падтрымкі беспрацоўных з боку дзяржавы, што не давала стымулаў для беспрацоўных рэгістравацца ў цэнтрах занятасці.

5. Павышэнне эканамічнага росту і дзяржаўнае рэгуляванне значна адбіліся на зніжэнні ўзроўню беспрацоўя асабліва ў апошнія гады.

Паколькі ў Беларусі былі нізкія тэмпы рэструктурызацыі гаспадаркі, а палітыка дзяржавы была скіравана на падтрыманне прамысловасці, якая часам мела праблемы

з рэалізацыяй гатовай прадукцыі, адбылося назапашванне працоўных рэсурсаў у выглядзе схаванага беспрацоўя на прадпрыемствах, неэфектыўнай занятасці і розных формах эканамічнай неэактыўнасці (якая ўключае беспрацоўных незарэгістраваных, занятых у “ценявой” эканоміцы, занятых у падсобнай гаспадарцы і іншыя групы). Прадпрыемствы праводзілі палітыку ўтрымання залішняй рабочай сілы, спадзеючыся на кан’юнктурнае паляпшэнне іх сітуацыі і ў сувязі з гэтым рост запатрабавання на рабочую сілу, а таксама карыстаючыся падтрымкай дзяржавы захавання занятасці і пазбягання звальненняў. Ва ўмовах павышэння эканамічнага росту гэтая палітыка сябе апраўдала, паколькі дазволіла захаваць працоўныя месцы і сацыяльную забяспечанасць насельніцтва.

Паўсталі пэўныя супярэчнасці ў вызначэнні ўзроўню беспрацоўя згодна з рознымі методыкамі падліку, у прыватнасці на падставе выбарачнага апытання насельніцтва прынятай Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), а таксама на аснове колькасці зарэгістраваных беспрацоўных у цэнтрах занятасці, што ўжываецца ў Беларусі. Праведзены Міністэрствам статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь у 1997г. падлік узроўню беспрацоўя, згодна са стандартам МАП, паказаў, што існуюць адрозненні ва ўзроўні беспрацоўя ў залежнасці ад метаду падліку і відавочна, што рэальнае беспрацоўе перавышае зарэгістраванае.

Наяўнасць значнай колькасці незарэгістраваных беспрацоўных, павышэнне удзельнай вагі эканамічна неактыўных у працоўным патэнцыяле краіны адрозніваюць паняцце “беспрацоўе” ў трансфармацыйнай эканоміцы і сфарміраванай рынкавай. У развітой рыначнай эканоміцы беспрацоўе – з’ява бінарная (г. зн. асоба працуе або беспрацоўная, занятая або знаходзіцца на пенсійным адпачынку). У краінах з трансфармацыйнай эканомікай гэтая мяжа размываецца па прычыне схаванага беспрацоўя, а таксама занятасці ў “ценявой” эканоміцы, падсобнай гаспадарцы і інш. Беспрацоўе ў гэтым выпадку носіць сацыяльны характар і выходзіць са структуры інстытутаў рынку працы. Паўстае неабходнасць больш дакладна вызначыць групы, якія складаюць беспрацоўе, для павышэння эфектыўнасці палітыкі занятасці, што павінна прывесці да больш эфектыўнага выкарыстання наяўнага працоўнага патэнцыялу краіны. Неабходна выдзяляць узровень агульнага беспрацоўя, рэгістраванае беспрацоўе, схаванае, або латэнтнае беспрацоўе, нерэгістраванае беспрацоўе (як частку эканамічна неактыўнага насельніцтва і занятых у падсобнай гаспадарцы). Адсюль можна зрабіць наступнае азначэнне катэгорыі беспрацоўя.

Беспрацоўе – гэта аб’ектыўная сацыяльна-эканамічная з’ява, якая адлюстроўвае узровень нявыкарыстанага патэнцыялу працоўных рэсурсаў, з’яўляецца унутрана абумоўленай часткай руху працоўнай сілы ў працэсе яе размеркавання і пераразмеркавання ў адпаведнасці з патрэбамі развіцця эканомікі, скіраваная на задавальненне патрэбаў людзей у вытворчым працэсе і абумоўленая прыватнымі асаблівасцямі і зацікаўленнем індывідаў.

У розных формах беспрацоўе можа праяўляцца як ў рыначнай, так і ў планавай эканоміках, дзе яно мае латэнтны характар. Для схаванага беспрацоўя трансфармацыйнай эканомікі характэрна размеркаванне цяжару беспрацоўя на усіх членаў працоўнага калектыву, што негатыўна адбіваецца на дысцыпліне працы і эфектыўнасці вытворчасці. Такім чынам, складаны шматаспектны характар беспрацоўя вызначае разнастайнасць формаў яго праяўлення. Вялікая колькасць сустракаемых класіфікацый беспрацоўя вынікае таксама з разнароднага характару выкарыстоўваемых статыстычных дадзеных па беспрацоўю і розных аналітычных падыходаў, сустракаемых у літаратуры.

Існуюць розныя інтэрпрэтацыі катэгорыі “рэгіянальны рынак працы”. Удакладняючы гэтае паняцце, можна прыняць азначэнне, што рэгіянальны рынак працы – гэта выдзеленая геаграфічная і прававая прастора, у межах якой адбываецца свабодны пераплыў працоўнай сілы, а выдаткі на пошук працы і паездкі на працу ў межах рэгіянальнага рынку працы значна ніжэйшыя ў параўнанні з адпаведнымі коштамі з па-за рэгіёна. Відавочна, што беларускі адміністрацыйны раён, у большасці выпадкаў, – гэта значна меншая геаграфічная прастора, чым рэгіянальны рынак працы, у які можа ўваходзіць некалькі раёнаў. Аднак мы прымаем гэты базавы ўзровень для аналізу і распрацоўкі прапаноў для рэгулявання рынкаў працы, паколькі ў межах вобласці раёны адрозніваюцца ўзроўнем эканамічнага развіцця, шчыльнасцю насельніцтва, накірункам спецыялізацыі, развіццём інфраструктуры і г. д. Больш эфектыўнае рэгуляванне можна праводзіць улічваючы асаблівасці раёнаў.

Фарміраванне і функцыянаванне рэгіянальных рынкаў працы ў Рэспубліцы Беларусь падчас трансфармацыйнага перыяду характарызуецца такімі тэндэнцыямі, як значная дыферэнцыяцыя беспрацоўя ў межах раёнаў, а таксама ўстойлівы яе характар; нізкі ўзровень працоўнай міграцыі, а таму недастатковая хуткасць рэалакацыі працоўных рэсурсаў; высокі ўзровень дыферэнцыяцыі беспрацоўя і нізкі ўзровень міграцыі працоўных рэсурсаў вядуць да кансервацыі стагнуючых рынкаў працы, а ў выніку – пашыраецца натуралізацыя эканомікі і занятасць па самазабеспячэнню. Гэтыя тэндэнцыі больш падрабязна разглядаюцца ў наступнай главе дысертацыі.

**Другая глава “Рэгіянальныя праблемы занятасці і беспрацоўя ў Беларусі”** змяшчае характарыстыку інстытуцыянальных умоў фарміравання і развіцця рэгіянальных рынкаў працы ў працэсе трансфармацыі, аналіз дыферэнцыяцыі беспрацоўя, даследаванне структуры занятасці ў рэгіёнах і абгрунтаванне неабходнасці яе дыверсіфікацыі. Прадстаўлена таксама распрацаваная методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы на падставе фактараў рэгіянальнага развіцця і структуры занятасці, выяўлены тэндэнцыі міграцыі працоўнай сілы і разгледжана пашырэнне занятасці па самазабеспячэнню ў дэпрэсіўных рэгіёнах.

Прынятае азначэнне рэгіянальных рынкаў працы дазваляе зрабіць аналіз дыферэнцыяцыі рэгіянальнага беспрацоўя на якасна новым узроўні. Устаноўлена, што паказчыкі дыферэнцыяцыі беспрацоўя на рэгіянальным узроўні ў Беларусі значныя і маюць устойлівы характар, што відаць з дадзеных табл. 1.

Табліца 1

Дыферэнцыяцыя беспрацоўя на ўзроўні раёнаў у 2003 і 2004 гадах

| Паказчык | 2003 | 2004 |
|---|---|---|
| Сярэдняе арыфметычнае, % | 3,5 | 2,1 |
| Мінімум, % | 0,9 | 0,7 |
| Максімум, % | 10,9 | 7,7 |
| Розніца, %-ныя пункты | 10,0 | 7,0 |
| Стандартнае адхіленне | 1,77 | 1,11 |
| Варыяцыя | 0,51 | 0,53 |

Як відаць з табл. 1, адрозненне паміж максімальным і мінімальным значэннямі з’явілася досыць значным і складала 10,0 і 7,0 у 2003 і 2004 гг. адпаведна. Тэндэнцыю да зніжэння можна растлумачыць паляпшэннем эканамічнай кан’юнктуры, а таксама дзеяннем адміністрацыйнага рэгулявання ўзроўню беспрацоўя. Паказчык варыяцыі, які адлюстроўвае дыферэнцыяцыю беспрацоўя, знаходзіўся на высокім узроўні ў 2003

г. і яшчэ ўзрос у 2004 г. Розніца ва ўзроўнях беспрацоўя паміж раёнамі асабліва адчувальнай з'яўляецца для іх жыхароў. Яна адлюстроўвае розніцу сярэдняй верагоднасці стаць беспрацоўным паміж пэўнымі раёнамі. Асабліва характэрнай з'яўляецца палярызацыя ўзроўняў беспрацоўя паміж раёнамі з найлепшай сітуацыяй на рынку працы і тымі, што маюць найвышэйшы ўзровень беспрацоўя. Сталічная агламерацыя ўтрымлівала падчас усяго працэсу трансфармацыі лідзіруючае становішча з найніжэйшым узроўнем беспрацоўя. Найбольш высокі ўзровень беспрацоўя адзначаецца ў сельскагаспадарчых рэгіёнах з нерэфармаванай структурай вытворчасці – Ганцавіцкім, Краснапольскім, Іванаўскім, Пастаўскім раёнах.

Дыферэнцыяцыя беспрацоўя ў раённым падзеле адбылася на пачатку працэсу трансфармацыі і застаецца ўстойлівай на працягу ўсяго перыяду. Раёны, якія на пачатку працэсу трансфармацыі апынуліся ў складанай сітуацыі на рынку працы, мелі праблемы і ў будучыні. Прычынамі ўстойлівага характару дыферэнцыяцыі беспрацоўя з'яўляюцца наступныя: 1) неадпаведнасць прапановы і попыту на рабочую сілу; 2) негатыўныя шокі попыту на тавары і паслугі, паколькі зніжэнне агульнага попыту мае таксама рэгіянальнае вымярэнне; 3) недастатковы ўзровень капіталу, які вынікае з абмежаваных інвестыцый у перыяд эканамічнай рэцэсіі; 4) зніжэнне кваліфікацыі беспрацоўных, асабліва доўгатэрміновых беспрацоўных, што характэрна для дэпрэсіўных рэгіёнаў; 5) агламерацыйныя фактары, якія заключаюцца перад усім у рознасці ёмістасцей спажывецкіх рынкаў.

Аналіз структуры беспрацоўя на рэгіянальным узроўні паказаў, што найбольшую верагоднасць патрапіць у стан беспрацоўя маюць жанчыны ва ўзросце 18–24 гадоў. Большая частка беспрацоўных мае агульную сярэднюю адукацыю або не мае сярэдняй адукацыі. Значны ўплыў на павышэнне сярэдняга паказчыка беспрацоўя мае ўзровень доўгатэрміновага беспрацоўя ў рэгіёне. Вызначаныя характарыстыкі афіцыйнага беспрацоўя на рэгіянальным узроўні абумоўліваюць неабходнасць актывізацыі моладзевай палітыкі, развіцця гнуткіх формаў занятасці і інфармацыйнай празрыстасці інфраструктуры рынку працы, стымулявання павышэння індывідуальнай канкурэнтаздольнасці на рынку працы моладзі.

Устаноўлена, што ва ўмовах трансфармацыйнага перыяду на паводзіны рэгіянальных рынкаў працы значны ўплыў мае тып структуры занятасці. Пры гэтым структура занятасці з'яўляецца чыннікам, які вызначае паводзіны індыкатараў рынку працы (узроўню беспрацоўя, занятасці, міграцыі і г. д.). Вызначана неабходнасць дыверсіфікацыі рэгіянальнай структуры занятасці. Горшае становішча на рынку працы маюць рэгіёны з сельскагаспадарчай структурай занятасці, што праяўляецца не толькі ў высокіх колькасных паказчыках беспрацоўя, але і ў якасных зменах, звязаных з тым, што беспрацоўе прымае "хранічныя і застойныя формы". Для стварэння эфектыўнай структуры занятасці неабходны ўлік галіновай спецыялізацыі рэгіянальных рынкаў працы і фактараў эканамічнага развіцця на ўзроўні раёнаў.

Для аналізу асобных груп раёнаў прапанавана методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы. Гэты метад заснаваны на выяўленні залежнасці індыкатараў рынку працы ад спецыялізацыі рэгіёна і рэгіянальнай структуры занятасці. Ён дазваляе выявіць прычыны росту беспрацоўя, напружанасці ў рэгіёне і беднасці, а таксама можа стаць асновай для распрацоўкі грунтоўных праграм папярэджання росту беспрацоўя ў рэгіёнах, праграм павышэння занятасці і праграм рэгіянальнага развіцця. Для класіфікацыі рынкаў працы і ацэнкі ўплыву на іх рэгіянальнай структуры занятасці выкарыстаны паслядоўны шматмерны выбарачны працэс, які ўключае наступныя этапы. На першым этапе выдзелены

высокаспецыялізаваныя рэгіёны. Для гэтага усе паказчыкі неабходна выразіць у выглядзе стандартных адхіленняў ад сярэдняй з дапамогай формулы.

$$z = \frac{x_i - \bar{x}}{s},$$

дзе дзе $z$ – стандартны лік; $x_i$ – $i$-ты паказчык; $\bar{x}$ – сярэдняя велічыня паказчыка; $s$ – стандартнае адхіленне паказчыка.

Згодна са шматмерным правілам адбору, высока спецыялізаваныя рэгіёны павінны адпавядаць наступнай умове: *удзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы або прамысловасці, выражаная ў стандартных адхіленнях ад сярэдняй, павінна быць большая за палову стандартнага адхілення ад сярэдняй па краіне.* На першым этапе фарміруюцца тры макрагрупы, дзве з якіх уключаюць высокаспецыялізаваныя рэгіёны. Група дыверсіфікаваных рэгіёнаў атрымліваецца як рэштавая (астатнія рэгіёны, якія не ўвайшлі ў групы спецыялізаваных), а значыць, высокагетэрагенная.

На другім этапе ўнутры высокаспецыялізаваных макрагруп выдзяляюцца рэгіёны з лепшай структурай занятасці і з лепшымі ўмовамі для развіцця. Для аналізу выкарыстоўваюцца індыкатары стану лакальнай інфраструктуры (выкарыстоўваем паказчык шчыльнасці аўтамабільных дарог у раёне як дэтэрмінанту рэгіянальнай эканамічнай структуры і сігналаў станоўчага рэгіянальнага развіцця) і развіцця гандлю. Вынікі тыпалагізацыі прадстаўлены на мал. 1.




Мал. 1. Рэгіянальнае размяшчэнне выдзеленых з дапамогай прапанаванай методыкі груп рэгіёнаў

Малыя і сярэднія прыватныя прадпрыемствы ў найбольшай ступені канцэнтруюцца ў сектары паслуг і гандлю. Гэты сектар з'яўляецца найбольш дынамічным ва ўсіх краінах з трансфармацыйнай эканомікай. Таму большая, чым

сярэдняя, доля занятых у гэтым сектары можа быць важным сігналам дыверсіфікацыі і развіцця рэгіянальнай эканомікі. На гэтым этапе выдзелілі сярод высока спецыялізаваных рэгіёнаў тры субгрупы. У выніку на трэцяй стадыі аналізу выдзелілі шэсць груп рэгіёнаў: развітыя аграрныя рэгіёны; астатнія аграрныя рэгіёны; развітыя прамысловыя рэгіёны; астатнія прамысловыя рэгіёны; дыверсіфікаваныя развітыя; дыверсіфікаваныя іншыя.

Выражаныя ў стандартных адхіленнях ад сярэдняй паказчыкі шчыльнасці аўтамабільных дарог і долі занятых у гандлі характарызуюць развітыя рэгіёны, калі паказчык быў вышэйшы за палову стандартнага адхілення ад сярэдняга і астатнія, калі ніжэйшы. Развітыя рэгіёны, якія, верагодна, хутчэй праходзяць працэс трансфармацыі і лепш дастасоўваюцца да рыначных адносінаў, характарызуюцца большай шчыльнасцю дарог і вышэйшым узроўнем развіцця прыватнага бізнесу ў рэгіёне. Такім чынам, распрацаваная методыка тыпалагізацыі рэгіёнаў будуецца зыходзячы са структуры занятасці ў рэгіёне і не ўлічвае наўпрост паказчыкі беспрацоўя. Аднак праведзеная з яе дапамогай класіфікацыя адпавядае сітуацыі на рынку працы. Як відаць з табл. 2, раёны з узроўнем беспрацоўя, вышэйшым за сярэдні па краіне, патрапілі у групы "іншыя", калі прыняць, што "развітыя" рэгіёны маюць шчыльнасць дарог вышэйшую, чым сярэдняя па краіне. Гэта пацвярджае правільнасць выбранага намі фактару, а таксама сведчыць пра значны ўплыў узроўню развіцця інфраструктуры на паказчыкі рынку працы ў раёнах.

Табліца 2

**Рэгіёны з найвышэйшым узроўнем беспрацоўя па групах класіфікацыі.**

| 2. Іншыя прамыслова-выя раёны | Un *, % | 4. Іншыя сельскагас-падарчыя раёны | Un, % | 5. Развітыя дыверсіфікава ныя раёны | Un, % | 6. Іншыя дыверсіфікава ныя раёны | Un, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бярозаўскі | 4,8 | Драгічынскі | 5,6 | Паставускі | 7,6 | Ганцавіцкі | 10,9 |
| Лунінецкі | 4,7 | Іванаўскі | 6,7 | Круглянскі | 5,9 | Кобрынскі | 4,5 |
| Полацкі | 4,3 | Маларыцкі | 4,3 | | | Лепельскі | 4,7 |
| Рэчыцкі | 6,3 | Столінскі | 5,7 | | | Калінкавіцкі | 5,4 |
| Рагачоўскі | 4,3 | Грдзенскі | 5,6 | | | Лельчыцкі | 5,3 |
| Светлагорскі | 4,6 | Дубровенскі | 5,4 | | | Бярэзінскі | 4,9 |
| | | Брагінскі | 4,9 | | | Быхаўскі | 4,6 |
| | | Акцябрскі | 5 | | | Касцюковіцкі | 6,2 |
| | | Любанскі | 4,4 | | | Краснапольскі | 10 |
| | | | | | | Чэрыкаускі | 4,3 |

**Заўвага:* Un,% – узровень беспрацоўя, дадзеныя па ўзроўню беспрацоўя Міністэрства працы і сацыяльнай абароны за 2003 г.

Дадзеная методыка дазваляе распрацоўваць адпаведную для кожнай групы раёнаў эканамічную палітыку і палітыку на рынку працы, што будзе спрыяць павышэнню занятасці ў рэгіёнах і іх устойліваму эканамічнаму развіццю.

Неабходна адзначыць, што наяўнасць рэгіянальных адрозненняў ва ўзроўнях беспрацоўя супярэчыць эканамічнай інтуіцыі, якая падказвае, што перамяшчэнне фактараў вытворчасці пад уздзеяннем рыначных сіл, "нябачнай рукі рынку", павінна ліквідаваць гэтую розніцу ў доўгатэрміновым перыядзе. Нераўнавага на рэгіянальных рынках працы, якая праяўляецца ў значных адрозненнях беспрацоўя і заработных

плат, павінна весці да міграцыйнага адплыву рабочай сілы з дадзенага рэгіёну і зніжаць беспрацоўе ў ім. З іншага боку, вялікі запас вольнай працоўнай сілы, што адлюстроўваецца больш высокім беспрацоўем, павінен зніжаць яе цану, прыцягваць інвестыцыйны капітал і стымуляваць стварэнне новых рабочых месцаў. У выніку рэгіянальныя дыспрапорцыі павінны быць ліквідаваны. Аднак у Беларусі падчас трансфармацыі эканомікі так не адбываецца, паколькі выяўлены нізкі ўзровень міграцыі працоўнай сілы, што "кансервуе" становішча на крытычных рэгіянальных рынках працы. Прычынамі нізкай міграцыі насельніцтва ў Беларусі з'яўляюцца інстытут прапіскі, неразвіты рынак жылля, высокія транспартныя выдаткі, звязаныя з пераездам на новае месца жыхарства. Рэгіёны, якія характарызуюцца ўстойлівым высокім узроўнем беспрацоўя маюць нізкі ўзровень міграцыі (галоўным чынам – гэта сельскагаспадарчыя рэгіёны), што не дае магчымасці рэгіянальнага пераразмеркавання працоўнай. Пры гэтым адзначаецца працяглы працэс эміграцыі працоўнай сілы з сельскай мясцовасці ў гарады, што бачна з мал. 2.




Мал. 2. Міграцыйны прырост (выбыццё) насельніцтва з сельскай мясцовасці па абласцям Рэспублікі Беларусь, тыс. чал.

Як відаць з малюнку 2, на працягу апошняга дзесяцігоддзя працэсу трансфармацыі ў Беларусі адбываўся працяглы прырост насельніцтва ў гарадах за кошт міграцыі з сельскай мясцовасці. Асабліва вялікі прырост насельніцтва назіраецца ў сталіцы. У г. Мінск накіраваны плыні працоўнай сілы як з сельскай мясцовасці, так і з іншых гарадоў рэспублікі. Гарады іншых абласцей адзначаюць значна меншы прырост насельніцтва і нават нязначны адплыў у апошнія гады. Вясковыя працоўныя рэсурсы інтэнсіўна выязджаюць з усіх абласцей рэспублікі. У апошні год адзначыўся значны міграцыйны прырост працоўных рэсурсаў у сельскай мясцовасці Мінскага раёна. Гэта сведчыць пра вялікі пераплыў працоўнай сілы ў сталічную агламерацыю, якая характарызуецца найлепшымі магчымасцямі працаўладкавання (найбольш нізкі паказчык беспрацоўя), найбольш высокім узроўнем аплаты працы, аднак таксама найбольш высокай канкурэнтаздольнасцю працоўнай сілы. Аналізуючы геаграфічнае размеркаванне міграцыйнага прыросту працоўнай сілы ў Беларусі, можна адзначыць, што адносна стабільным становішчам па міграцыйнаму балансу характарызуюцца абласныя цэнтры і рэгіёны паблізу буйных прамысловых гарадоў. Найбольшы ўзровень маятнікавай міграцыі з вёсак у гарады адзначаецца ў Брэсцкай вобласці, якая характарызуецца найбольш высокім узроўнем дыферэнцыяцыі беспрацоўя. У сярэднім па рэспубліцы 4,5% сельскага працоўнага насельніцтва штодзённа ездзіць на працу ў горад і складае пры гэтым 1,23% гарадскіх працоўных рэсурсаў. Рост беспрацоўя ў рэгіёне ці малым горадзе не

прыводзіць да значнага росту маятнікавай міграцыі. Перашкодай для павелічэння маштабаў гэтага тыпу міграцыі з'яўляюцца высокія транспартныя выдаткі.

У рэгіёнах з высокім узроўнем беспрацоўя і нізкім узроўнем міграцыі адбываецца пашырэнне занятасці па самазабеспячэнню як стратэгіі падтрымання ўзроўню жыцця. Дзейнасць, якая ўключае асабістыя паслугі, што выконваюцца членамі дамашніх гаспадарак бясплатна, дабравольна, на грамадскіх пачатках, а таксама вытворчасць прадукцыі для ўласнага канечнага спажывання (сельскай, лясной гаспадаркі, паляўніцтва, рыбалоўства і г. д.), а таксама прыватныя трансферы, абумоўленыя цеснымі сваяцкімі і сацыяльнымі сувязямі, адносіцца да **самазабеспячэння**. Неабходна адрозніваць нефармальную занятасць ад занятасці ў самазабеспячэнні. Нефармальная занятасць – гэта незарэгістраваная дзейнасць (вытворчасць, гандаль, паслугі і г. д.), прадукты якой скіраваны на продаж і прыносяць грашовы даход. Нефармальны сектар абмяжоўваецца рыначнай дзейнасцю хатніх гаспадарак. Да працы па самазабеспячэнню адносіцца любая праца, вынікі якой скіроўваюцца непасрэдна для задавальнення патрэбаў домагаспадаркі, абмінаючы рынак. Да самазабеспячэння можна аднесці таксама такую сацыяльна важную працу, як выхаванне дзяцей, а таксама ўсё, што звязана з вядзеннем дамашняй гаспадаркі: пранне, рамонт уласнага аўтамабіля і г.д., а таксама выраб кансерваў, гадоўля дамашняй жывёлы і іншае. У высокаразвітых краінах самазабеспячэнне праяўляецца як стыль жыцця або задавальненне спецыяльных патрэбаў (выраб уласнымі рукамі хатніх рэчаў, вырошчванне кветак і інш). У краінах, што праходзяць працэс трансфармацыі, самазабеспячэнне выступае як стратэгія выжывання і задавальнення патрэбаў.

Самазабеспячэнне ўзнікае пры выкананні наступных умоў: 1) бюджэтныя абмежаванні домагаспадаркі (недахоп грошай, для набыцця тавараў на рынку); 2) рыначныя абмежаванні (адсутнасць пэўных тавараў на рынку або іх дэфіцыт); 3) прафіцыт бюджэту часу (шмат вольнага часу).

Беспрацоўныя, якія занятыя самазабеспячэннем ў меншай ступені губляюць свае працоўныя здольнасці, а таксама часта засвойваюць новыя ўменні, у меншай ступені адчуваюць спад даходаў. Прычынай узнікнення і пашырэння самазабеспячэння ва ўмовах трансфармацыйнай эканомікі з'яўляецца няздольнасць працаўнікоў ва ўмовах фармальнай занятасці задаволіць свае патрэбы і нават патрэбы першай неабходнасці. У дысертацыйнай працы распрацавана анкета для даследаванняў узроўню самазабеспячэння сярод беспрацоўных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь.

**У трэцяй главе "Сацыяльныя аспекты рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы ў працэсе рэструктурызацыі эканомікі"** прапануецца методыка маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь, на павышэнне канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ўплывае ўзровень інвестыцый у чалавечы капітал, абгрунтавана неабходнасць рэструктурызацыі гаспадаркі на ўзроўні рэгіёнаў як адзін з фактараў павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўнага патэнцыялу рэгіёна.

Вывучэнне замежнага вопыту паказала, што эфектыўная рэструктурызацыя пазітыўна ўплывае на становішча рэгіянальнага рынку працы. Прадпрыемствы працуюць больш эфектыўна, а узровень даходаў і занятасці ў рэгіёне ўзрастае, зніжаецца беспрацоўе. Параўнаўчы аналіз развіцця шкляной прамысловасці ў рэгіёнах Беларусі, Расіі і Польшчы пацвердзіў, што рэструктурызацыя буйных горадаўтвараючых прадпрыемстваў вядзе да павышэння ўзроўню занятасці ў рэгіёне, а таксама ўзроўню даходаў працаўнікоў. Прадпрыемствы працуюць эфектыўна і

прыносяць больш сукупных фіскальных даходаў у мясцовыя бюджэты, што дазваляе ўтрымліваць сацыяльную інфраструктуру. Рэструктурызацыю неабходна праводзіць на мікраўзроўні, што цягне за сабой вызваленне залішняй працоўнай сілы або вызваленне схаванага беспрацоўя, а таксама на макраўзроўні, што закранае дыверсіфікацыю структуры занятасці ў рэгіёне і спрыяе развіццю малога прыватнага прадпрымальніцтва, якое можа забяспечыць значную колькасць эфектыўных працоўных месцаў.

Узровень інвестыцый у чалавечы капітал, а гэта значыць узровень адукацыі і прафесіяналізму працоўнай сілы, вызначае яе рэгіянальную канкурэнтаздольнасць. Для параўнання канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы па ўзроўню адукацыі выкарыстаны паказчык індэкса адукацыйнага ўзроўню працоўнай сілы рэгіёна, які разлічваецца як дзель колькасці працаўнікоў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй на колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце ў кожным раёне Рэспублікі Беларусь. У якасці індыкатара, які адлюстроўвае ўзровень канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы па прафесійна-кваліфікацыйнаму складу, у міжрэгіянальных параўнаннях выкарыстаны паказчык удзельнай вагі высокакваліфікаваных кадраў у агульнай колькасці працоўнай сілы, або індэкс узроўню прафесійнай кваліфікацыі працоўнай сілы. Важным паказчыкам канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы рэгіёна з'яўляецца ўзровень аплаты працы. З аднаго боку, нізкі ўзровень заработнай платы павінен прыцягваць інвестыцыі ў рэгіён, а з другога – больш высокі ўзровень даходаў прыцягвае кваліфікаваную працоўную сілу. Таму гэты паказчык неабходна ўлічваць у комплексе з іншымі. Разлічваецца таксама індэкс працоўнай актыўнасці насельніцтва як дзель колькасці працаўнікоў ва ўзросце 25-49 гадоў да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва (сума колькасці беспрацоўных і колькасці занятых). Для усіх вышэйпералічаных паказчыкаў разлічваем індэксы ў адносінах да рэгіёна-"эталона", за які прымаем г. Мінск. Урэшце разлічваем інтэгральны індэкс, які з'яўляецца сярэдняй арыфметычнай усіх вышэй пералічаных індэксаў. Вынікі разліку прадстаўлены на малюнку 3.




Мал. 3. Індэксы канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы у раёнах Беларусі.

На малюнку 3 бачна геаграфічнае размяшчэнне раёнаў з рознымі ўзроўнямі канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы, якая, у сваю чаргу, адлюстроўвае канкурэнтныя перавагі саміх раёнаў. Найлепшай канкурэнтаздольнасцю характарызуецца працоўная сіла Мінскага раёна, што прылягае да сталічнай агламерацыі. Гарадская працоўная сіла найбольш канкурэнтаздольная ў Салігорску, а вясковая – у Брэсцкім раёне. Каб вызначыць, якія фактары ў большай ступені спрыялі канкурэнтным перавагам працоўнай сілы гэтых рэгіёнаў, неабходна звярнуцца да прыватных індэксаў. Выяўлена заканамернасць, што рэгіёны з “горшай” структурай занятасці і вышэйшым узроўнем беспрацоўя характарызуюцца ніжэйшым узроўнем канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы.

Зыходзячы з праведзенага аналізу зробленыя наступныя прапановы для палітыкі занятасці на рынку працы ў Рэспубліцы Беларусь.

- Паколькі асноўны патэнцыял беспрацоўных знаходзіцца ў стане схаванага беспрацоўя на прадпрыемствах, неабходна стымуляваць працадаўцаў наймаць працаўнікоў непасрэдна з прадпрыемстваў, якія ўтрымліваюць залішнюю працоўную сілу. Неабходна забяспечыць абсорбцыю схаваных беспрацоўных больш эфектыўным сектарам прыватнага малога і сярэдняга бізнесу, мінаючы стадыю яўнага беспрацоўя.
- У беларускай рэчаіснасці беспрацоўе носіць “размыты” характар па прычыне вялікай удзельнай вагі схаванага беспрацоўя, неэфектыўнай занятасці, нерэгіструемага беспрацоўя. Таму неабходна больш эфектыўна акрэсліць мэтавыя групы для ўздзеяння палітыкі занятасці. Першай мэтавай групай для ўздзеяння палітыкі занятасці павінна быць рабочая сіла прадпрыемстваў, якія ўтрымліваюць яе лішкі. Колькасць схаваных беспрацоўных на канкрэтным прадпрыемстве можна ацаніць з дапамогай экспертнага апытання. Другая мэтавая група, якая часта папаўняе шэрагі беспрацоўных, павінна ахопліваць студэнтаў ВНУ, ПТВ і школьнікаў. Трэцяя – гэта доўгатэрміновыя беспрацоўныя. Для гэтых трох груп можна стварыць праграму актывізацыі і інтэнсіфікацыі пошукаў на рынку працы.
- Інтэнсіўнасць пошукаў на рынку працы стварае ўяўленне аб значнай канкурэнцыі на рынку працы, што стымулюе павышэнне прадукцыйнасці і эфектыўнасць працы ўжо працуючых, а таксама запавольвае тэндэнцыю павышэння заработных плат (што, у сваю чаргу павышае попыт на працу). Метады павышэнне інтэнсіўнасці пошукаў на рынку працы распрацаваныя ў заходняй літаратуры і ўключаюць элементы прафарыентацыі, псіхалагічнай дапамогі, павышэнне інфармаванасці аб дзейнасці рынку працы і метадах пошукаў вольных вакансій і інш. Такое навучанне можна арганізаваць у цэнтрах занятасці для доўгатэрміновых беспрацоўных, у навучальных установах і на дзяржаўных прадпрыемствах.
- Вылучэнне тыпаў беспрацоўя, згодна з яго прычынамі, дае нам магчымасць зразумець, што сродкі супрацьдзеяння, якія з'яўляюцца эфектыўнымі для зніжэння аднаго тыпу беспрацоўя, могуць выклікаць павышэнне другога. Структурнае беспрацоўе ў Беларусі немагчыма знізіць толькі дзякуючы эканамічнаму росту. Неабходна павышаць эластычнасць прапановы працы, што будзе спрыяць зніжэнню узроўню беспрацоўя.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Зроблены аналіз тэорый рынку працы, а таксама замежных і айчынных метадалогій даследавання рынкаў працы і рэгіянальнага беспрацоўя. Беспрацоўе – гэта комплексная і складаная праблема, якая вызначаецца рознымі ўмовамі і ўзроўнем

развіцця вытворчасці, вытворчай і сацыяльнай інфраструктурамі, тэрытарыяльным размяшчэннем, узроўнем чалавечага капіталу і г. д. З гэтай прычыны ніводная тэорыя цалкам не можа адпавядаць умовам Беларусі, тым болей з улікам рэгіянальных асаблівасцей. Таму для рэгулявання і пераадолення залішняга беспрацоўя кіруючыя органы, кіраўнікі прадпрыемстваў і фірмаў, а таксама непасрэдныя вытворцы павінны ведаць аналагічныя праблемы ў розных рэгіёнах і ўзяць для пераймання толькі тыя метады, якія прыдатныя для Беларусі і яе рэгіёнаў, дадаўшы да гэтых канцэпцый усе адметныя, характэрныя для нашай гаспадаркі рысы [3, 6].

2. Пры ўдакладненні паняцця “беспрацоўе” з улікам асаблівасцей Беларусі і яе рэгіёнаў, устаноўлена, што пэўная частка беспрацоўя ў Беларусі носіць завуаліраваную форму, існуе значны запас схаванага беспрацоўя. Адным з вызначальных фактараў, якія ўплываюць на развіццё рынку працы і эканамічнае развіццё рэгіёна, з’яўляецца структура занятасці ў ім [2, 3, 13].

3. З улікам замежных метадалагічных распрацовак у ходзе даследавання распрацавана методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы ў Беларусі. На аснове статыстычнага групавання выдзелена шэсць груп рэгіёнаў, якія характарызуюцца аднолькавымі тэндэнцыямі і маюць блізкія праблемы. Праведзеная тыпалагізацыя дазволіла вызначыць дыферэнцыяцыю рэгіянальнага беспрацоўя, якая аказалася даволі значнай. Тыпалагізацыя рэгіёнаў у залежнасці ад структуры занятасці, а таксама выяўленне дыферэнцыяцыі беспрацоўя з’яўляюцца важнай умовай для вызначэння мераў барацьбы з беспрацоўем на ўсіх узроўнях [4, 12].

4. Рэгіянальныя дыспрапорцыі занятасці ў значнай ступені могуць быць пераадолены пры дапамозе міграцыйных плыней. Аналіз рэгіянальнай унутранай міграцыі паказаў, што міграцыйныя плыні скіраваны з вясковых і малых гарадскіх паселішчаў у буйныя гарады. Асабліва высокі прырост працоўных рэсурсаў адзначаецца у г. Мінску і Мінскім раёне. Перамяшчэнне рабочай сілы ў буйныя гарады і паселішчы вакол іх не можа даць значнага эфекту ў зніжэнні беспрацоўя, калі не будуць палепшаны ўмовы ўзнаўлення працоўнай сілы ў малых гарадах і вёсках. У адваротным выпадку будзе адбывацца міграцыйны прырост гарадскога насельніцтва цаной некваліфікаванай рабочай сілы з сельскай мясцовасці, адначасова будуць вымывацца працоўныя рэсурсы з сельскай гаспадаркі з пагрозай зніжэння прадукцыйнасці працы [12, 13, 15].

5. Цяжкасці з атрыманнем высокааплатнай працы і беспрацоўе ў большасці рэгіёнаў Беларусі падчас працэсу трансфармацыі прывялі да імкнення часткі насельніцтва да самазабеспячэння. Паводле нашай тыпалагізацыі большая ўдзельная вага самазабеспячэння характэрная для сельскагаспадарчых рэгіёнаў. Значная частка харчовых сельскагаспадарчых прадуктаў выпрабляецца ў падсобнай гаспадарцы не на продаж, а для ўласнага спажывання па-за асноўнай занятасцю, без уступлення ў рыначныя адносіны. З аднаго боку, нельга пярэчыць такому імкненню людзей да павышэння сямейных даходаў, а з другога – трэба ўлічваць тое, што самазабеспячэнне праз працу ў падсобнай гаспадарцы вядзе да празмернай занятасці і таму – да зніжэння прадукцыйнасці працы на асноўным месцы працы [7, 8, 12].

6. Дзеля пераадолення беспрацоўя неабходна праяўляць пастаянны клопат аб няухільным павышэнні канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы. Галоўны фактар такога павышэння – інвестыцыі ў чалавечы капітал у розных формах. Менавіта праз такія выдаткі можна павысіць магчымасць прыцягнення інвестыцый у рэгіён і паслаблення напружанасці на рынку працы. Адной з формаў барацьбы з беспрацоўем як сёння, так і ў перспектыве з’яўляецца глыбокая рэструктурызацыя рэгіянальнай эканомікі. На

прыкладзе двух шклозаводаў у Беларусі і Польшчы пераканаўча паказана, што рэструктурызацыя галіны шкловырабаў вядзе да значнага паніжэння беспрацоўя ў рэгіёне і з'яўляецца надзейным штуршком для яго далейшага эканамічнага развіцця[5].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


### *Артыкулы*

1. Кулажанка У.А., Казлоў А.С. Праблемы рынку працы Рэспублікі Беларусь // Труды БГТУ. Сер. VII Экономика и управление. – 2002. Вып. X. – С. 59–1.
2. Казлоў А.С. Асаблівасці фарміравання рэгіянальнага рынку працы у Беларусі // Труды БГТУ. Сер. VII Экономика и управление. – 2003. – Вып. XI. – С. 126–128.
3. Казлоў А.С. Рэгіянальныя асаблівасці беспрацоўя ў Беларусі // Труды БГТУ. Сер. VII Экономика и управление. – 2004. – Вып. XII. – С. 54–59.
4. Казлоў А.С. Тыпалагізацыя рэгіянальных рынкаў працы і аналіз структуры занятасці ў Рэспубліцы Беларусь // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2005. – № 3. – С.60–65
5. Козлов А.С. Конкурентоспособность рабочей силы в регионах Беларуси // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2005. – № 4. – С. 19–25.
6. Казлоў А.С. Рэкамендацыі па павышэнню эфектыўнасці рэгіянальнай палітыкі занятасці ў Рэспубліцы Беларусь // Труды БГТУ. Сер. VII Экономика и управление. – 2005. – Вып. XIII. – С. 46–48.

### *Матэрыялы міжнародных канферэнцый*

7. Казлоў А.С. Самазабеспячэнне як форма пераадольвання негатыўных наступстваў беспрацоўя // Управление в социальных и экономических системах: Материалы XII Международной научно-практической конференции, Минск, 5 дек. 2004 г. / Минск. ин-т. управ. – Минск, 2004. – С. 325–326.
8. Казлоў А.С. Праблемы занятасці і фарміравання даходаў насельніцтва гарадоў памежнага рэгіёна // Проблемы экономического развития региона: Материалы Международ. науч.-практ. конф., Гродно, 29-30 апр. 2004 г., / Гродней. гос. ун.-т. – Гродно, 2004. – С. 110–113.
9. Козлов А.С. Развитие жилищной недвижимости как условие воспроизводства человеческого капитала в малых городах Республики Беларусь // Экономика, оценка и управление недвижимостью: Материалы Международ. науч.-практ. конф., Минск, 2-3 мая 2004 г., / Белорус. гос. технол. ун-т. – Минск, 2004. – С. 145–148.
10. Казлоў А.С. Інвестыцыі ў чалавечы капітал, як аснова росту працоўнага патэнцыялу ў рэгіёне // Управление экономическим потенциалом региона в условиях международной интеграции: Материалы Международ. науч.-практ. конф. для аспирантов и молодых ученых, Гомель, 17–18 нояб. 2004 г. / Гомел. гос. ун-т. – Гомель, 2004. – С. 83–85.
11. Козлов А.С., Шевчик О.В. Некоторые аспекты реструктуризации градообразующих предприятий Республики Беларусь в трансформационный период. // Управление экономическим потенциалом региона в условиях международной интеграции: Материалы Международ. науч.-практ. конф. для аспирантов и молодых ученых, Гомель, 17–18 нояб. 2004 г. / Гомел. гос. ун-т. – Гомель, 2004. – С. 200–202.
12. Казлоў А.С. Дыверсіфікацыя структуры занятасці як умова ўстойлівасці сацыяльна-эканамічных сістэм рэгіёнаў // Проблемы создания механизма конкурентоспособного менеджмента: Материалы V Международ. науч.-практ. конф., Минск, 17-18 мая 2005 г., / УП "Гипросвязь". – Минск, 2005. – С. 37–39.
13. Казлоў А.С. Рэгіянальная мабільнасць працоўных рэсурсаў, як фактар паспяховай рэструктурызацыі // Мадэльныя праграмы рэструктурызацыі і рэфармавання эканомікі:

Материалы 3-й Международ. науч.-практ. конф., Минск, 23–25 июня 2005 г. / Белорус. аграрн. техн. ун-т. – Минск, 2005. – С. 128-134.

*Тэзісы навуковых дакладаў*

14. Казлоў А.С. Праблемы занятасці на прадпрыемствах прамысловасці будаўнічых матэрыялаў // Тез. докл. 53-й студ. науч.-технич. конф. БГТУ, Минск, 20-25 мая 2002 г. / Белорус. гос. технол. ун-т. – Минск, 2002. – С. 249–251.
15. Казлоў А.С. Рэгіянальная дыферэнцыяцыя беспрацоўя ў Беларусі // VIII республиканская научно-техническая конференции студентов и аспирантов "НИРС – 2003", Минск, 9–10 декабря 2003 г.: Тез. докл.: В 7 ч. Ч. 2 / Белорус. нац. технич. ун-т. – Минск, 2003. – С. 137.
16. Казлоў А.С. Аналіз структуры беспрацоўя на лакальных рынках працы малых гарадоў Мінскай вобласці // IX Респ. науч. конф. студ. и аспир. Республики Беларусь "НИРС–2004": Тез. докл.: В 8 ч. Ч 7 / Гроднен. гос. ун-т. – Гродно, 2004, – С. 78–80.

# РЭЗЮМЭ

**Казлоў Аляксей Сцяпанавіч**

## Рэгіянальныя рынкі працы ў трансфармацыйнай эканоміцы Беларусі

**Ключавыя словы:** трансфармацыйная эканоміка, рынак працы, занятасць, беспрацоўе, рэструктурызацыя, канкурэнтаздольнасць, працоўныя рэсурсы, міграцыя, чалавечы капітал, дзяржаўнае рэгуляванне, сацыяльная абарона, рэгіянальнае развіццё.

**Аб'ект даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляюцца рэгіянальныя рынкі працы Рэспублікі Беларусь (у абласным і раённым адміністрацыйным падзеле).

**Прадмет даследавання.** Прадметам даследавання выступаюць эканамічныя адносіны, заканамернасці, працэсы і праблемы функцыянавання і рэгулявання рэгіянальных рынкаў працы ў Беларусі ў працэсе трансфармацыі эканомікі.

**Метады даследавання:** метад навуковага абстрагавання, параўнаўчага, лагічнага і сістэмнага аналізу, метад паслядоўнага шматмернага выбарачнага працэсу, графічны метад, статыстычныя метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У рабоце вызначаны тэндэнцыі нераўнамернага рэгіянальнага размеркавання беспрацоўя і немагчымасць іх ліквідавання толькі рыначнымі механізмамі; распрацавана методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы на аснове структуры занятасці і ўзроўню развіцця метадам паслядоўнага мнагамернага выбарачнага працэсу; раскрыты наступствы "кансервацыі" дэпрэсіўных рэгіянальных рынкаў працы і тэндэнцыя пашырэння занятасці па самазабеспячэнню, як асабліваму спосабу падтрымання ўзроўню жыцця беспрацоўных; удасканалена методыка вызначэння ўзроўню і маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь; зроблены прапановы па фарміраванню Дзяржаўнай і рэгіянальных праграм занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

**Рэкамендацыі па выкарыстанню:** Распрацаваныя ў дысертацыі метадалагічныя палажэнні, такія як методыка тыпалагізацыі рэгіянальных рынкаў працы, інструмент маніторынгу канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рэгіянальным узроўні, а таксама вызначаныя заканамернасці унутранай міграцыі могуць выкарыстоўвацца дзяржаўнымі кіруючымі органамі для выяўлення канкурэнтных пераваг рэгіёнаў і прыняцця эфектыўных рэгулюючых мер па рэгіянальна-раўнамернаму развіццю. Методыка вызначэння канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы ў рэгіёнах можа прымяняцца дзяржаўнымі, прыватнымі і міжнароднымі інвестарамі з мэтай вызначэння найбольш аптымальнага размяшчэння капіталу.

**Вобласць прымянення:** Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, абласныя і раённыя упраўленні па рэгіянальнай эканамічнай палітыцы, рэгіянальныя цэнтры занятасці, патэнцыяльныя інвестары і іншыя зацікаўленыя арганізацыі.

# РЕЗЮМЕ

**Козлов Алексей Степанович**

**Региональные рынки труда в трансформационной экономике Беларуси**

**Ключевые слова:** трансформационная экономика, рынок труда, занятость, безработица, реструктуризация, конкурентоспособность, трудовые ресурсы, миграция, человеческий капитал, государственное регулирование, социальная защита, региональное развитие.

**Объект исследования.** Объктом исследования являются региональные рынки труда Республики Беларусь (в областном и районном административном делении).

**Предмет исследования.** Предметом исследования выступают экономические отношения, закономерности, процессы и проблемы функционирования и регулирования региональных рынков труда в Беларуси в процессе трансформации экономики.

**Методы исследования:** методы научного абстракции, сравнительного, логического, системного анализа, метод последовательного многомерного выборочного процесса, графический метод, статистические методы.

**Полученные результаты и их новизна.** В работе определены тенденции неравномерного регионального распределения безработицы и невозможность их ликвидации только рыночными механизмами; разработана методика типалогизации региональных рынков труда на основе структуры занятости и уровня развития региона методом последовательного многомерного выборочного процесса; раскрыты "консервации" депрессивных региональных рынков труда и тенденции расширения занятости по самообеспечению, как способу поддержки уровня жизни безработных; усовершенствована методика определения и мониторинга конкурентоспособности рабочей силы в регионах Республики Беларусь; сделаны предложения по формированию Государственной и региональных программ занятости населения Республики Беларусь.

**Рекомендации по использованию:** Разработанные в диссертации методологические положения, такие как методика типологизации региональных рынков труда, инструмент мониторинга конкурентоспособности рабочей силы на региональном уровне, а также определенные закономерности внутренней мигарции могут использоваться государственными руководящими органами для определения конкурентных преимуществ регионов и принятия эффективных регулирующих мер по регионально-равномерному экономическому развитию. Методика определения конкурентоспособности рабочей силы может применяться государственными, частными и международными инвесторами с целью определения наиболее оптимального размещения капитала.

**Область применения:** Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь, Министерство Экономики Республики Беларусь, областные и районные управления по региональной экономической политике, региональные центры занятости, потенциальные инвесторы и другие заинтересованные организации.

## SUMMARY

**Aliaksei Kazlou**

**Regional labour markets in the transition economy in Belarus**

**Key words:** transition economy, labour market, employment, unemployment, restructuring, competitiveness, migration, human capital, state regulation, social protection, regional development.

**Object of research.** The research objects are regional labour markets in Belarus (in regional administrative division).

**Subject of research.** As a subject of the research are economic relations, laws, processes and problems of functioning and regulation of regional labour markets in Belarus during transformation of economy.

**Methods of research:** method of scientific abstraction, method of comparative, logic and system analysis, a method of consecutive multivariate selective process, graphic method and statistical methods.

**The main results and their novelty.** The tendencies of the regional disparities of distribution of unemployment are determined in the research and the impossibility of its reducing only by market mechanisms is underlined; the methodology of the classification of regional labour markets is developed on the basis of structure of employment and a level of development of regions by a method of consecutive multivariate selective process; consequences of the "preservation" of depressive regional labour markets and the tendency of expansion of employment on self-maintenance, as a way of support of a standard of living of the unemployed are studied; the technique of definition and monitoring of competitiveness of a labour in regions of Belarus is developed; offers on formation State and regional programs of employment of the population of Belarus are prepared.

**Recommendations on use:** the methodological positions developed in the dissertation, such as a technique of classification of regional labour markets, the tool of monitoring of competitiveness of a labour at a regional level, and also the certain tendencies of internal migration can be used by the state directing bodies for definition of competitive advantages of regions and acceptance of effective regulating measures on economic development without regional disparities . The technique of definition of competitiveness of a labour can be applied by the state, private and international investors with the purpose of definition of the optimal accommodation of the capital.

**Field of application:** the Ministry of Labour and Social Protection of Belarus, the Ministry of Economics of Belarus, regional economic policy, the regional centers of employment, potential investors and other interested organizations.

Падпісана да друку 23.03.2006. Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 60 экз. Зак. 307.

Надрукавана з гатовага арыгінала-макета заказчыка
ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.